ABBA

**PROUD TO BE BELARUSIAN BUSINESS**

*Удзельнікам 32-га Эканамічнага форума ў Карпачы*

Паважаныя калегі!

Традыцыйна ў пачатку верасня Эканамічны Форум адкрывае дыялог аб перспектывах Польшчы, Цэнтральнай Еўропы і кантынента ў цэлым. Гісторыя Форума – гэта гісторыя паспяховых пераўтварэнняў, пабудовы эфектыўнай эканомікі, рэалізацыі амбітных планаў. Гэта гісторыя поспеху не толькі асобна ўзятай краіны, але і сведчанне эфектыўнасці сумленнай канкурэнцыі і грамадскага запыту на чыстую рэпутацыю.

Сёння ў самым цэнтры Еўропы ідзе вайна. Мая Радзіма – Беларусь – практычна страціла самастойнасць. Бесперапынныя, беспрэцэдэнтныя ў сваёй жорсткасці і ў сваім маштабе рэпрэсіі вымушаюць пакідаць свае дамы многіх беларусаў, у тым ліку і шматлікіх прадстаўнікоў бізнесу. Мы ўдзячныя Еўрапейскаму Звязу за падтрымку, магчымасць рэлакаваць бізнес і развіваць яго ў бяспечным і спрыяльным для гэтага асяроддзі.

Асацыяцыя беларускага бізнесу за мяжой (ABBA) ганарыцца магчымасцю прадстаўляць сумленны беларускі бізнес. На сённяшні дзень ABBA – адзіная нацыянальна-арыентаваная асацыяцыя беларускага бізнесу. Прыхільнасць да дэмакратычных каштоўнасцяў, асуджэнне ваеннай агрэсіі Расеі, выразна выяўленая пазіцыя супраць дыктатуры Лукашэнкі і Пуціна, а таксама жаданне працаваць на пабудову новай дэмакратычнай Беларусі – асноўныя каштоўнасці, якія аб'ядноўваюць усю нашу каманду і сяброў Асацыяцыі. Дзелавая этыка, пабудаваная на гэтых прынцыпах для нас не проста словы, а прынцыповая пазіцыя для ўсіх сяброў Асацыяцыі.

Гэта дазваляе нам з упэўненасцю сцвярджаць, што сябры нашай Асацыяцыі не толькі развіваюць сваю справу і робяць значны ўнёсак у еўрапейскую эканоміку, але і закладаюць асновы Новай Беларусі. Менавіта нацыянальнае прадпрымальніцтва стане лакаматывам змен у нашай краіне, як яна стала ініцыятарам перамен па ўсёй Еўропе. Рэжым упадзе, а Лукашэнка і тыя, хто супрацоўнічае сёння з ім, панясуць адказнасць.

Расейская вайна ва Украіне не пакідае выбару. Быць на баку агрэсара непрымальна. Мы павінны быць сумленнымі ў першую чаргу перад сабой – толькі так мы зможам змяніць Еўропу да лепшага. Нашая сіла – у салідарнасці, добрапрыстойнасці і празрыстасці нашых намераў і нашых дзеянняў.

Мы з упэўненасцю кажам: ганарымся быць беларускім бізнесам!

Яўген Буры
Прэзідэнт ABBA

AB BA